Цэна асобнага нумэру 5 кап.

# НАША НІВА

Выходзіць што тыдзень.

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: **Вільня, Віленская вул., № 29.**

Цэна с перасылкай і дастаўкай на 1 г.—2 р. 50 к., на 6 мес.—1 р. 25 к. на 3 м.—65 к., на 1 мес.—25 к. За граніцай: на 1 г.— 4 р. на 6 мес.—2 р. 3 мес.—1 р. Перамена адрэсу—20 кап.

Абвесткі прыймаюцца на апошняй страніцы па 20 кап. за лінейку малымі літэрамі Рукапісы і карэспандэнцыі, прысланые у рэдакцыю, павінны быць чытэльна напісаны с праўдзівай фаміліей і адрэсам таго, хто яе прысылае. Можна такжэ падпісаць прозвішчэ разам с фаміліей, хто не захочэ каб была надрукавана праўдзівая фамілія. Адрэс і фамілія толькі для ведама рэдакцыі. Рэдакція пакідае за сабой права папраўляць і укарачываць прысланые рукапісы і аўторам назад іх не звертае.

Год X. 1 Мая 1915 г. № 17

## Рэдкае здарэньне.

Хаця офіціяльна скрозь у нас пануе хрысьціянства, хаця кожын праваслаўны, ці каталік моліцца у свaей сьвятыні Хрысту, каторы пакінуў людзям вялікі наказ: «любі бліжняга свайго, як сябе самога», — як мала спатыкаем мы людзей, каторые ня толькі лічацца хрысьціянамі, але і спаўняюць найвялікшую запаведзь сваей веры — аб *любві да чалавека!* На кожным кроку йдзе сварка і змаганьне між сынамі аднаго народу, толькі розных вер, між сынамі аднаго краю, толькі розных націй. Скрозь паношыцца злосьць і ненавісьць да суседзёў—грамадзян адвечных роднай усім нам зямелькі, ды толькі затым, што яны інакш гавораць, інакш—па свойму — молюцца...

Праўда, цяпер, у час страшэннай вайны, якой сьвет ад пачатку дзён ня бачыў, — цяпер трудна гаварыць аб міласьці братняй. А усё-ж такі ёсьць людзі, каторые, ня гледзючы на крывавы туман, што спавіў увесь сьвет, ня толькі шыраць думкі аб брацтве людзей і народоў, але і дзелам выяўляюць сваю веру у іх: бо прыйдзе час, і мінецца змаганьне і злосьць і ненавісьць, і згода і любоў запануець на сьвеці!

Гэткіе людзі, што не пагублялі веры у вышэйшые ідэалы чалавечэства, ёсьць і у нас. Толькі невідочна сідзяць яны па сваіх кутох, робячы сваё штодзенные дзела: на шырэйшую арэну жыцьця, где йдуць безупынные змаганьня, яны ня хочуць выступаць.

Вось, маленькі прыклад. Ціха, неўзнак, невідочна зышоў у магілу у Высокім-Літоўскім (у Гродзеншчыне) доктар К. Кобрынец. Мала хто ведаў аб ім, ды толькі з газэт цяпер дачуліся аб яго сьмерці. А вось жэ ён якраз і паказаў сябе тым чалавекам, для каторага — паводлуг слоў Хрыста — «німа ні грэка, ні жыда», для каторага усе — людзі, усе — браты.

Доктар Кобрынец атпісаў перад сьмерцю усё сваё меньне на розные карысные грамадзкіе справы: на навуковые таварыствы, на шпіталі і прытулкі, на навуку бедных даяцей у гімназіях, на шпіталь для сухотнікоў і т. д. Але у гэтым ліку звертае на сябе ўвагу йшчэ тое, што доктар Кобрынец атпісаў па 500 руб. *на цэркву, касьцёл і жыдоўскую бажніцу* у Высокім-Літоўскім.

Тутака справа не у ліку атпісаных грошы, а у тым, што доктар Кобрынец паказаў сваім запісам, што ён гэтак сама глядзіць на усе веры у нашым краю, што у яго вера ня можэ і не павінна дзяліць людзей, не павінна быць прычынай сваркі між імі.

Рэдка мы чуем цяпер гэткіе словы, ешчэ менш спатыкаемся з гэткімі паступкамі. На «версе»— між інтэлігэнцыей нашага краю усё вастрэй і вастрэй ідуць сваркі на нацыональным і рэлігійным грунці. І гэтые сваркі памалу з *верху* даходзяць *у ніз*—да шэрага працоўнага люду, уліваюць яд злосьці і ненавісьці у яго чыстую душу, каторая заусёды шанавала у другім *чалавека*. Народу робіцца крыўда — цяжкая крыўда, якой нялёгка пазбыцца... Ніхай жэ прыклад, які даў нашай інтэлігенціі доктар Кобрынец, пакажэ ей, што дарога, на якую яна ступіла, гэта дарога фальшывая, што толькі у еднасьці і брацтве людзей і народоў — іх сіла, будучына, шчасьце!

а—н—а.

## ВАЙНА.

**На Заходнім (францускім) фронце** вялікіх перамен за гэты тыдзень не было. Нямецкіе атакі у некаторых мейсцох хаўрусьнікі карысна адбіваюць. Час ад часу праціўнікам удаецца адабыць колькі сажнёў непрыяцельскіх акопоў, а больш нічога такога сур'ёзнаго не чуваць.

**Неваюючые дзержавы.** Апошнімі часамі звертала на сябе увагу нязгода паміж Кітаем і Японіей. Японіі захацелася, карыстаючы с цяперашняй шуміхі у Эўропі, налажыць на кітайцоў сваю моцную лапу. Кітай с пачатку не хацеў паддацца гэтай непрошэнай апецы японцоў, што чуць ня выклікало новай вайны, але пасьля пайшоў на уступкі, і цяперака Японія мае тое, чаго хацела, а Эўропа можэ глядзець спакойна, што вайны у Азіі ужо ня будзе. Толькі-ж усё такі агулам новай вайны з дня на дзень можэм спадзевацца. А гэту вайну, здаецца, змайструе Італія. Рэч у тым: Італьянцам вельмі хочэцца захапіць у свае рукі некаторые часткі Адрыатыцкага узбярэжжа, што цяпер належыць да Аўстры. Ад пачатку вайны да апошняга часу Італія з Аўстрыей таргавалася за гэтые землі, але нічога з гэтаго ня вышла. Цяперака дзержавы, ваюючые з Аўстрыей, аддаюць гэтые землі для Італіі с тым варункам, што Італія выступіць з вайной проці Аўстры.

## С пазыціі.

*Ад нашаго карэспандэнта.*

Каму прышлося быць на перадавых пазыціях, як напр. карэспандэнтам газэт, або тым паном, што прывозюць гасьцінцы для салдатоў, то напэўна, прыкмеціўшы добра, паказалася ім дзіўнай і незразумелай цяперашняя вайна. Стаяць расейцы з немцамі нос з носам, а наўперад не наступаюць ні тые, ні другіе, хоць німа між войскам ніякіх ні узгоркоў, ні крэпасьцей. Самая большая перашкода іншы раз бывае, то гэта —маленькая рэчка, абапал каторай акапаўшыся на супраціўных берагох, седзяць цэлымі месяцами абодвы праціўнікі, не асьмеліваю-

чыся ні той ні другі перарастуціць гэтай рэчкі. І «сьмеласьцяй» у гэтым палажэньні нічога ня зробіш; прыходзіцца чэкаць больш стасоўнаго часу.

У цяперашняй вайне арміі носюць крэпасьці с сабой. Маюць іх, так сказаць, у кішэнях гатовые. Прышлі, астанавіліся, акапаліся, абгарадзіліся, паставілі сотні кулемётаў, гарматоў, і ўжо да іх не падступісся, хоцьбы войска раздзеляла толькі чыстае поле або невялічкая рэчка.

Возьмім, напрыклад, хоцьбы рэку Бзуру. Па берагох яе расейскае і нямецкае войска сядзіць у вакопах ад лістапада месяца і ані скранецца. А што ж гэта за перашкода? Рэчка ўсяго такая, цераз каторую у любы час маглі-б навесьці за поўгадзіны пантонные масты як расейцы, так і немцы. Але ніхто ненаводзіць. Прабавалі было гэту работу ды аставілі. Навесьці пад агнём непрыяцельскім масты і цераз іх перакінуць вялікую сілу пяхоты і артылерыі ні зашто няможна. Так сядзелі і седзяць па берагох Бзуры расейцы і немцы.

Жыцьцё спакойнае жыхароў акалічных сяліб вымерла як на адным беразі, так і на другім, бо ўсіх жыхароў па суседзтву выселілі, будынкі папалілі. А ваякі пакапалі сабе глыбокіе акопы, панацягівалі туды дзьвярэй, акон, камэньня; дзьвярмі і дошкамі абабілі сьцены акопаў, каб не абсыпалася земля; каменьнямі замасьцілі дно акокоў, каб было суха пад нагамі. Так, укрываючыся ад агню арудзій, расейцы і немцы схаваліся з верху зямлі у акопы.

С першых часоў прабавалі за лініямі асопоў рабіць землянкі і, бытцым па згодзі з аднэй стараны і з другой, гэтые землянкі нейкі час былі у пашані: іх бытцам не бачылі, цярпелі. Але немцы вельмі раскашэліліся, устроіліся па дамашняму; спалі у цяпле і на пасьцелях. Дык вось, расейцы даведаўшыся аб гэткім «панстві» немцоў у землянках, надумаліся нарушыць іх спакойнае жыцьцё. Па землянках нямецкіх замалаціла расейская артылерыя. Праціўнікі не асталіся ў даўгу і пачалі граміць расейскіе землянкі. Пасьля усяго гэтаго немцы перабраліся у акопы, але ў землянках, каторые уцалелі, ад часу да часу тапілі печы, найбольш днём. Расейцы дзівіліся, што гэта значыць—немцы дымам выдаюць сяба. Але скора распазналі, што гэта нямецкая хітрасьць: — жыць у землянках не жылі, а пускалі з іх дым, каб значыцца, гэтым выклікаць расейскіх пушкароў на стрэляніну і заставіць такім чынам траціць на дарма набоі.

Паказацца з акопоў на пярэдніх лініях ні зашто ня можна ні днём, ні ў ночы. Ночай кулі ніжуць яшчэ гусьцей і часьцей, чымся днём. Сьветла ня трэба: кулі і ў пацёмках б'юць кожную высунуўшуюся галаву на верх.

І так жыцьцё ўсё ідзець пад зямлёй. Пастаўленая варта зорка сьледзіць за непрыяцельскімі акопамі, а рэшта седзяць «дома» цэлымі суткамі. Пішуць ад німа чаго рабіць лісты. Пішуць доўга, многа і многім. А хто ня пішыць, той скідае сваю споднюю апратку і ўстраівае аблаву на «белую зьвярыну».

**Язэп Шнэт.**

16/IV 1915 г.

---

# На загоне.

Хацеў-бы я трохі пагаманіць аб тым, як у нас вядзецца гаспадарка, а тым болей, зьвярнуць увагу на гаспарку каля жывёлы. Ёсьць-жэ, дзякуй Богу, і ў нас жывёлы і немала, але калі глянуць на яе, дык аж душа баліць—толькі тые косьці скурай абцягнуты. А калі паслухаць кагось з нашых гаспадароў, калі пагукаць з ім аб гаспадарцы, дык ён ня можэ ўцяміць, чаму яму не ручыць жывёла і чаму яна такая? Гаспадар-жэ добра яе даглядаіць: трасянку даець два разы ў дзень, саломку-аржаніцу трэць, сена прытрасаіць, праўда, хоць і балотлівае,—але-ж карова—ня конь—павінна есьці,—да вады ганяіць раз у дзень—каля палудня, а для дойнай кароўкі яшчэ, апрача гэтаго, гаспадыня стараецца цэбар запарыць з якой мякінай, зліваючы туды усялякіе памыі. Зімой-жэ гаспадар у хлеві шчэлак не затыкаіць у сьцяне, сталяваньня ня хутаіць,—гэта, значыцца, каб дух быў павольны. Але як прыдзіць зіма, як пацісьніць мароз, дык не устаець карова сама, хоць ты што хочэш рабі Гаспадар з гаспадыняй кожную раніцу бяруць у гаршчок агню, дастаюць вяроўкі і ідуць у хлеў падымаць карову, каторая у дабавак ўся трасецца ад сьцюжы. І нямогуць яны тут ніяк уцяміць, чаму гэта іх карова не ўстаець сама. Але, як баба дагадлівейшая, дык зарэз яна і выказывае мужу прычыну ўсей бяды:

— Вось, не казала я табе, што ня будзем купляць рабой каровы, бо не ручыць нам гэта масьць ані, ды яшчэ й купілі ў Язэпа Шчэпкі, што мае такую цяжкую руку, ад якой і не спадзейся што небуць скарыстаць, — летась парасё дасталі ад яго і то воўк на другі дзень пацягнуў.

Пачэшыць гаспадар патыліцу ды і паверыць бабе, дабавіўшы ад сябе:

— Яшчэ, мусіць, ці ведаіш, да гэтаго трэба далажыць і тое, што не залюбіў дамавік нашу кароўку.

І гэтакімі забабонамі наша вёска багата і ў гэтым нашы селяне бачуць усю бяду.

А ўжо аб малако, дык німа чаго і гаварыць. Калі ў гаспадарцы 2—3 каровы, то не заўсёды малака хапаіць ля сваей сям'і, а ня то што, каб масла зьбіць ці прадаць на якую капейку. Ходзіць, ходзіць гаспадыня даіць каровак, выцягаваіць па якой кватэрцы, а нарэшці і жаліцца суседцы, што «зарвала кароўка і недаець анічога», а суседка гэтак сама ёй жаліцца аб сваіх.

І найчасьцей гэтак ужо бываіць у нас, што хоць кароўкі ёсьць, але берасьценчыкі стаяць пустые, а дзеткі зазіраюць у вочы суседзёў, калі там якая капля малака завядзецца.

Выганюць-жэ сьвянцонай вербай на Юр'я у поле жывёлу, пакурыўшы зёлкамі, дык тая ад ветру хіляіца; але гаспадар цешыць сябе надзеяй, што на зялёнай траве паправіцца.

Калі-ж дзе паша пры балоці, як гэта ў нашай вёсцы, то не пасьпеюць прысьці да хаты, як ужо ляціць пастушок наказываць, каб ішлі цягаць,—карова угразла,—ды гэтак мо на дзень разоў пяць.

Гэтакую мы маім карысьць ад нашых каровак.

Другая частка гаспадаркі так сама пастаўлена ў нас ня лепей. Аром мы свой загон яшчэ да гэтуль дзядоўскай сошкай, якойсь лапыркай, грэбаючы толькі зьверху, самы струпок зямлі; барануім, гэтак сама, дрэўлянай бараной, зубы ў якой па бервяну таўсьціні і, вядома, такой бараной толькі зьверху загладзіш ральлю'—ля во-

---

# Чэлавек без крыві.

**І. Жывіцы.**

Недаўна у нашым N—ску памёр мой стары прыяцель, на жаль, не сваей сьмерцяй. Нябошчык вярнуўся с сылкі і спачатку быў вясёлы і усё зьбіраўся зноў узяцца за працу на карысьць роднай старонкі. А ў нядоўгім часе з ім зрабілася нейкая зьмена—спахмурнеў, пачаў адсоўвацца ад людзей, нават блізкіх, і ў канцы налажыў на сябе рукі.

Аб цікавым жыцьці гэтаго чэлавека с чыстым сэрцам і вялікімі здольнасьцямі а неласкавай доляй я яшчэ спадзеюся расказаць некалі чытачам, а пакуль-што друкую яго, здаецца ядыны твор, знайдзены мною сярод другіх папероў нябошчыка. Мо' людзі, знаўшые яго, зразумеюць, якую муку нёс у сабе гэты чэлавек і слова асуду яму не зляціць з іх вусноў.

---

— Дык чаму, пытаецеся, твар мой бледны такі і вочы запалые, і рукі белые с сінімі жылкамі, і ад чаго пахілы я, кволы, як тое зельля, што расьцець у скляпох сярод вільтоці і гнілога паветра? А той, знаны вам, быў саўсім іншым чэлавекам! Чамуж?—Хіба трэба яшчэ пытацца? Хіба, нават, каб няведалі, ня можна адгадаць, што я прыйшоў з няволі?! Хіба твар мой, вочы мае, рукі мае, карк мой крывы і цела кволае ня сьведчуць вам, што я—чэлавек без крыві? З няволі, з няволі вярнуўся я, — зразумейце гэта і не пытайцеся больш!

Хай кроў мая гнілая, вільготная, хай сэрца маё як дрыгва,—пашкадуйце мяне і не пытайцеся!

Ах, сорам мне, ах, ганьба мне! Праклянцьце на галаву маю, на дзень той, што першы ясным сонейкам павітаў мяне — нешчасьцьця дому свайго і гора маткі сваей... Галубачка мая сівакрылая! зязюлечка! ластавачка мая гаротная! Ці помніш ты, як бянёхала мяне малога, як плакала ты над калыскай маей, калі плакаў я і як сьмеялася, калі я сьмеяўся? Ці помніш ты дзень той прыгожы, калі пагнаўшыся за свавольным зайчыкам, якога любое сонейка пусьціла праз балонку у хатку нашу, я аддзяліўся ад лавы і зрабіў першые два крокі па бітай падлозі? Якім шчасьцем засьвеціліся вочы твае тагды і сама ты абпрамянілася, як сонцэ! А, смачнейшые выбіраючы, кавалачкі хлеба і сала укладала у торбачку маю—дзянны харч мой у школку — помніш ты? А ці помніш, матачка, як далёка за ваколіцу выходзіла ты спаткаць мяне с школы? Якою гордасьцяй залівалася тваё сэрцэ і твар твой расцвітаў, калі ты чула пахвалы мне ад чужых? І потым, як спагадаючы маладасьці пазірала на мяне з маей мілаю і згодная, ў сэрцы з маім выбарам, казала: «добрая з вас, дзетачкі пара? Помніш ты? Помніш-жэ?

Ах, бачу я, помніш ты гэта і нават болі, чым помніш! Думкі і вочы твае не нацешацца тым, што прайшло ўжо і дні сягоняшніе замяніла ты ўчарайшымі днямі. Дык адарвіся-ж ад іх! Прызнай-жэ твайго пярвінку, ўлі ў сэрцэ маё кроплячку роднаго пачуцьця і убачыш, як заб'ецца яно, як чырвоным зробіцца твар мой і вясёлымі вочы, і простым карк мой, і моцным цела.

У няволі, ў няволі жыў я гэтые гады і захірэй без роднаго паветра, і зрабіўся як гнілое зельля у гнілым скляпу!..

А цяжкая-ж гэта рэч — няволя — і што яна з людзьмі робіць!..

С перша, як злоўленае арлё, нічога ня ведаеш і кідаесся ў вокны на жалезные краты, у шчылінкі, — усюдах, адкуль ідзець сьвет, — абы уцячы, абы вярнуць сабе волю. Але-ж не: краты моцные і шчылінкі вузкіе і цераз іх не праціснесся. Яшчэ не трацючы надзеі пачынаеш біць галавой і кулакамі, і усім целам стукацца аб сьценкі—дарма! Мур стаіць сабе нязрушаны, а галаве і ўсяму робіцца балюча. У злосьці, ў роспачы, грызеш тады сабе рукі і раздзіраеш грудзі свае да крыві, плачэш, крычыш—дарма, толькі жорстка-сэрдэчная варта рагочэ, гледзючы на твае мукі. У канцы нестаець сілы. Кідаесся на падлогу, моцна сплюшчываеш вочы і хочэш памерці. І сьмерць ня йдзе! Мучысся гэтак; зьменяюцца дні і ночы, ў сэрцы тваім надзея зьменяецца роспаччу і роспач надзеяй многа-многа разоў, і толькі тагды, паціху і паволі, як астрожны вартоўнік, падкрадаецца к табе сьмерць.

Каб-жэ-ж гэта была яна! Каб ня жыць саўсім! Не бачыць, ня думаць, нехацець, ня быць!

У няволі гэтак не паміраюць. Вось я, з белым тварам і рукамі с сінімі жылкамі, і вачмі без жыцьця, а хто скажэ з вас, што я нябошчык? Усе забыліся, ніхто ня можэ пазнаць, нават родная маці кажэ: «гэта ня сын мой», а ніхто не скажэ, што я нябошчык.

Бо сьмерць мая — жыцьцё маё, і гэта сьмерць, якой паміраюць у няволі. Толькі тамака можна гэтак цяжка канаць, так мучыцца ня стогнучы, бо німа каму слухаць і каму памагчы. Толькі тамака, ў няволі, прыходзіць нехта, ці нешта, і, раз прыпаўшы да грудзей, ужо не адыходзіць, пакуль ня выссе усёй крыві і сам не атруецца той атрутаю, якую пусьціў у жылы.

І калі яно пачнецца, адразу перастаеш усьміхацца нават найлепшаму ў сьвеці: яснаму сонцу і прамінуўшым дням сваім. І гневацца на найгоршае ў сьвеці, на зьневагі чэлавечай павагі тваей перастаеш Ясны дзень, ці ходзюць па небі чорные хмары—ўсё роўна. Далі табе спакою, ці дратуюць цябе і зьдзекуюцца над табой—усё роўна. Нічога не жадаецца сабе, ні другім. Нічога ня хочэш рабіць. Сьвет навокал робіцца мутным і белым, як вочы сьляпога, і невыразным, як твар звар'яцелаго. Нешта парнае, праціўнае, замест паветра ўліваеца ў грудзі, ласкочэ ў горлі, туманіць розум і робіцца тваей істотаю. Ах, цяжка мне людзі!

Чаму гэта сэрцэ чэлавечае такое, што ёсьць у ім нейкіе сховы, дзе крыецца людзкая боль? Чаму забыўшыся аб мінуўшчыні, ўспамінаеш будучыну, а убачыўшы наперадзі сябе чорную бэздонную яму, баісся яе і, маўляў забрытаны конь, пакіраваны ў ночы рукой баспэчнаго ездака, стаеш і круціш галавою, і ўпіраесся, ня хочучы далей ісьці, і шкадуючы жыцьцё сваё трасесся ўсім целам? Нашто мне жыцьцё, калі яно сьмерць, калі родные мае ня ведаюць мяне, а маці чураецца мяне? І хіба вам, людзі, што ня хочэце прыняць мяне за свайго, ня ўсё роўна? Нашто пытаецеся, чаму твар мой бляды? Нашто дакучаеце, даведаючыся, чаму вочы мае запалые і рукі белые с сінімі жылкамі? Праз цікавасьць? Хіба ёсьць закон такі паміж вас, чужое горэ абцяжаць сваей безупыннай цікавасьцяй і дзеля памаўзлівасьці сваей бярэдзіць чужые раны? Ці можэ міласэрдзе ўзварухнала сэрцэ ваша і, пашкадаваўшы мяне, запыталіся? Тое міласэрдзьдзе, якое робіць цуды і падыймае з ложа сьмерці, якое зола-

ка. Штучны гной мала хто знаіць і карыстаіць з яго. Гаспадары між сабой, не ладзяць гаспадарскіх хаўрусоў, каб выпісываць гаспадарскіе прылады, штучные гнаі і інш., што не па сілі зрабіць аднаму. Праўда, пачатак зрабілі і ў нас болей свьядамейшые гаспадары, і праканаліся, што толькі злучыўшыся ў гуртк! можна лёгка паправіць гаспадарку і мець болей з яе выгранкі. Але большая частка у нас такіх гаспадароў, што баяцца перайсьці на другі спосаб гаспадаркі, дзе прысьвечываіць навука,—баяцца яны навукі, якая ва ўсім ідзець нам на помач. Не цікавяцца, як вядуць гаспадарку суседзі. Мала чытаюць. І вось жывець другі, абы з дня на дзень перабіцца. Калі шнурок не даець хлеба на ўсю сям'ю —гаспадар пасылаіць свайго сына ці дачку ў горад на заработкі, або і сам ідзець, забываючыся усім на сваю гаспадарку.

Трэба прызнацца, што, каб жыць лепей нашаму брату, яму на дорозі шмат стаіць уселякіх перашкод

Але што-ж, не ламаць-жэ нам рук ад жальбы, не плакаць-жэ нам ад гора, за галаву ўзяўшыся, а трэба нам паруціцца працягнуць адзін аднаму хутчэй руку на помач, каб супольнымі сіламі скінуць с сваіх гарбоў гэту векавечную нядолю і зьдзек.

У гэты самы найцяжэйшы час ля ўсіх, калі вайна так шмат парабіла шкоды у кожнай хацінцы, ня трэба ўжо саўсім ў бяду ўдавацца, а трэба, як гэта ні цяжка, на братніх касьцёх закладаць моцную падмуроўку для лепшаго жыцьця, для лепшай будучыны.

Паглядзім на гаспадарку сумежных з намі суседзёў, якіе так сама змагаліся і змагаюцца са ўсякімі перашкодамі і наладзілі гаспадарку як ня трэба лепей.

Ўзяць напрыклад латышоў. У іх, можна сказаць, лепш гаспадарка пастаўляна ад усіх народоў Расеі. Там адразу народ скеміў, што толькі агульна працуючы можна змацаваць гаспадарку. І вось селяне-латышы пачалі хутка закладаць сельска-гаспадарскіе гурткі, якіх шмат маюць цяпер. Прыгэтым-жэ, дзеля лепшай карысьці у гаспадарцы, сталі заводзіць лепшую малочную жывёлу. Там ня дзіва, калі карова дасьць гаспадыні у год якіх пудоў 11 масла ці больш за 250 пудоў малака.

Каб завясьці лепшую пароду кароў, латышы сталі ладзіць атхоўные мейсцы, куды выпісываюць з заграніцы лепшых валоў, плацючы часам каля тысячы рублёў за адну штуку. Каб сабраць грошы на вала, кожны гаспадар кладзець у моцію 10 руб. ад 3 кароў, да гэтаго $^{1}/_{3}$ частку грошы дакладаіць казна. Такіх злучных мейсцоў налічываецца каля 140, у якіх больш сотні—быкі заграничные. Хаўрусьнік, даўшый грошы, каб купіць вала, маіць право атхаваць карову 3 разы дарма, а не хаўрусьнік плаціць 6 рублёў. Дзеля таго, што не ўсякі гаспадар можыць дагледзіць і вырахаваць, што бярэ ад яго карова і колькі карысьці за гэта даець яму, ля гэтаго ўзноў гаспадары гуртуюцца між сабой і наладжываюць так званы кантрольны хаўрус,—наймаюць кантроль-асыстэнта, каторы і распараджаіцца над жывёлай, даючы ўселякіе рады гаспадару, як яе даглядаць. чым карміць, колькі даваць корму і г. д.

Збываюць малочны спажытак селяне ізноў самі, не даючы каму другому на іх дабрэ нажываць лёгкіе грошы.

С помачы хаўрусоў адкрываюцца малочные заводы саміх селян, куды аддаецца малако за плату. Завод выробляное масло отпраўляіць цераз «Экспортную кантору» ва ўсе канцы сьвету.

Невялікіе хаўрусы гуртуюцца каля „Цэнтральнаго Т-ва“; гэтых апошніх латышы маюць 3. Невялікі хаўрус пасылаіць туды свайго чэлавека, за якога кладзець 25 рубл. у год.

Адзін «Рыжскі цэнтральны сельска-гаспадарскі хаўрус» маіць пад сваім кірункам 106 хаўрусаў, з якіх: 27 малочных коопэратывоў, 4 пчалаводные гурткі, 74 сельска-гаспадарскіе і 1 коопэратыўны хаўрус, („Рыжскі“), які у свой чарод маіць пад сваім загадам нівялікіх коопэраторoў. Тутжэ ёсьць «Ашчадна-пажычкавае Т-во», якое злучаіць у сябе сельска-гаспадарскіе касы і касы гарадзкіе, дзе па уставу сельска-гасп. маюць перавагу у упраўленьні, апрача гэтаго—«Экспортная кантора», якая атпраўляіць масла, пад маркай «Балтік». „Рыжскі центральны хаўрус“ аткрыў сваё сельска-гаспадарскае вучылішчэ, дзе вучацца каля 130 вучнёў, і вучацца не дзеля таго, каб скончыўшы, быць якім дзе фанабэрыстым пісарчуком, а каб умела, с карысьцяй працаваць на сваім загоні.

Усё гэта сьведчыць аб тым, як моцна пастаўляна у латышоў гаспадарка. Вырасла усё гэта не само і не ў адну часіну, а было прыложена шмат шчырай працы і шмат загублена часу, каб здабыць тое. што маюць латышы цяпер.

Вось і нам, беларусам, так сама трэба падумаць аб сваей гаспадарцы, бо ужо на гэта даўна час і пара.

Хлопцы, скончыўшы сельска-гаспадарскіе вучылішчы, не павінны толькі старацца, каб заняць «штатнае» мейсцэ і, надзеўшы чорны каптан, забыць на шэраго хлебароба, якому зрэбная кашуля рэжыць цела, а вочы крывавым потам зліваюцца ад працы на чужую карысьць.

Трэба, каб кожны рупіўся удзяліць сваё знаньне для свайго народу, для сваей бацькоўшчыны. Нясіце ў вёску навуку у роднай мові, у складзі душы беларуса. Завіце да суполак, тлумачце, што ня чорт тут вінен у нашей беднаце, а ёсьці іншые перашкоды, ад якіх можна вызваліцца толькі агульнымі сіламі.

Часы цяжкіе насталі і завуць кожнаго да працы.

**Міхалка Скарэўскі.**

# З Беларусі і Літвы.

## З Віленшчыны.

**Абавязываючай пастановай** глаўны начальнік дзьвінскаго ваеннаго округу забараніў пад карай 3000 руб. штрафу або 3 мес. турмы занечышчаць рэкі, каналы, студні, правадзіць пад'зямельные трубы ў рэкі і каналы і псаваць ваду для піцьця.

Другой абавязываючай пастановай пад грозьбай тэй самай кары апавешчаецца, што ўсе дамаўласьнікі і гаспадары кватэр у мястэчках, вёсках і інш. заселеных мейсцох павінны дастаўляць сельскім ўласьцям або паліціі ведамасьці аб усіх кватэруючых у іх дамох або ў нанятых кватэрах кватэрантах і акуратна паведамляць названые ўласьці аб выехаўшым або наехаўшым кватэранці.

**Справы** аб сумысным падпалі а такжэ убіўстві будуць перэдавацца у ваенны суд.

там праменьняў сваіх прыбівае цьму і душы сьляпые выводзіць з панства роспачы, і пахучымі кветкамі абсыпае іх, і купае у млечнай расе векавечнаго шчасьця? Калі гэтак, непытайце-ж, а бардзей прыйміце мяне на грудзі свае і скажыце мне: «брат мой» і «сын мой», каб сэрцэ маё, разагрэўшыся ад ласкі вашай, часьцей забілася і вышэй ўзнімаліся грудзі набіраючы роднаго паветра, і зноў палілася у жылы чырвоная кроў, і кветкамі жыцьця аздабіўся твар, і шчасьцем заблішчэлі вочы. Ці найзьлейшых сабак сваіх нацкуйце на мяне, каб яны перагрызьлі горла маё, забралі сьмерць маю і жыцьцё маё, і я нескажу, што вы без літасьці.

Бо з няволі, з няволі вярнуўся я і немаю спакою!..

**Алесь Гарун.**

# Мыш.

I

Іван Іванавіч Кукуеў—бугальтар казённаго банку, прыходзіў на службу раней ад іншых. Прывычка позна класьціся і рана уставаць была зайздроснай асаблівасьцяй яго натуры. Хаця-ж, хто знаў Кукуева ўперад, тые кажуць, што гэтаго з ім не было даўней,—прыдбаў ён гэтую прывычку толькі с тых час, як заступіў мейсцэ бугальтара. «Рахункі жыцьцё сушаць», кажуць людзі. Лічыць заўсёды чужые грошы, а ня мець сваіх... —ня вельмі соладка сьпіцца.

Але на гэты раз Кукуеў апазніўся. З'явіўся ён на службу ня высцаны, ўзрушаны, бытцам пасьля ночы, праведзенай у трывозі. Так выгледаюць чыноўнікі двацацатаго чысла, прагуляўшы праз ноч усё жалаваньне. З усяго відаць было, што гэту ноч Кукуеў зусім не спаў.

— Гэт, знаеце, Міхал Міхайлавіч, — усюсеньку цалюсеньку ноч сягоньня я ані на волас не задрэмаў. Да позна вазіўся з атчотам.. Змучыўся—ну, думаю, пасплю. Аж—нет! Мышэй у нас гэтулькі развялося, што нема і ратунку. Вось ужо заплюшчыш вочы, засьнеш здаецца... дык тут калі загайсае па сталяваньні — якбы мятлой хто іх там паушкае! Піск, візг, бы каты у марцы...

— А скора і марэц...—раздумляючы атказаў памоцнік Какуева,—скора і марэц...

— «Марцовы кот...»—памысьліў Кукуеў, гледзючы на Міхала Міхайлавіча, і прыняўся ляпаць на шчотах.

Роўна, у радок, складаюцца костачкі шчотаў, і такжэ роўна водзе пальцам Іван Іванавіч на лісту паперы, дробна спісаным у роўные ланцужкі дробных лічбаў. Адляскае Іван Іванавіч на шчотах, зірне на лічбу, ад'значэ сабе і зноў адложэ на шчотах. Бывае, іншымі момэнтамі, твар Івана Іванавіча насупляецца, бровы моршчуцца, і ён з нейкай немарасьцяй бярэ пяро, абмочанае у чырвонае чарніла, і хутка перакрэсывае лічбу, кідаючы мімаходам косы пагляд на свайго памоцніка.

Хутка ляскае Іван Іванавіч на шчотах, (не дармо ён лічыцца у банку першым у гэтым дзелі). І пальцы яго па рубрыцы «ведамасьці», як піла па шнуру, плывуць паволі да камля—«ітога». Вось Іван Іванавіч паверае апошнюю рубрыку у ведамасьці...

— Ач—хі!.. А, каб цябе! Баш, от, катару дастаў!

— На здароўе, Іван Іванавіч! Іспалненьня...

Іван Іванавіч мацнуў па кішэнях, але не знайшоўшы хустачкі, пасунуўся да шафы, дзе на кручку вісела яго пальто. Ткнуўшы руку у пальто, Іван Іванавіч рвануў яе назад с такім імпэтам, бытцам там сядзела гадзіна,— і на падлогу звалілася хустачка, а з яе выскачыла... мышка.

Зглядзіўшы гэтаго зьвера, Кукуеў агарнуўся раптоўнай злосьцяй і, сьціснуўшы зубы, ён як цігра скочыў на бедную перэпалоханую мышку і з усей моцы сваіх апсацаў наступіў ён на хвост. Піснула мышка, рванулася, але другі безжаласны наступ апсаца адняў у яе жыцьцё...

II

— «Ах, Іван Іванавіч! Загубілі?.. Мышто загубілі?! Сярод посту—грэх гэтакі. А-яй!»

На бедную загубленую жывёлку сабраўся паглядзець амаль што ня ўвесь банк. Нават пісарчукі «з акладам» 25 руб. павылазілі з-за сталоў і сьмялей як заўсёды падходзілі да Івана Іванавіча. Кожны меў за абавязак сказаць што небудзь і усе дзівіліся з мышы і са спрытнасьці Івана Іванавіча. А Кандрат Сьцепанавіч—банкоўскі гаварун, чэлавек с прычуванай душой і вялікай склоннасьцей да розных прымовак, знашоўся і тут каб сказаць належачую прамову. Зрушыўшы нагой мышу, ён працяг да яе рукой і сказаў:

— «Бедная мыш! Сном спакойным ты сьпіш—непрабудным. Пражыла ты свой век увесь нудным, непрыгожым, дарэмным жыцьцём... Ты пазнала ўсе страхі аблавы, сьцераглася катоў... І без славы ты загінула тут во, — у банку, у жыцьця свайго с самага ранку...» Тут аратар зацяўся, не дакончыўшы мовы: з дзьвярэй «кабінэта» высунуліся ногі, за імі галава, і ў «бугальтэрню» увыйшоў дырэктар. Чыноўнікі схамянуліся, зашамяшыліся, але іх выручыў сам дырэктар.

— Што, інтэрэсная навасьць?.. — спытаў ён. (Дырэктар, бачыце, думаў, што чыноўнікі чытаюць тэлеграму аб ваенных удачах).

— Так тошна, ваша прэвосхадзіцельства!.. Немцы б'юць аўстрыйцаў... — Адрапартаваў Кандрат Сьцепанавіч і асекся, згледзіўшы здзіўлёны твар у свайго начальніка.

— Вот як! Ха-ха-ха!.. Немцы ды аўстрыйцаў?.. Лоўка!

Добрасклонны сьмех начальніка разуважыў чыноўнікоў, і інстынкт угодлівасьці змусіў іх да дэлікатнай усьмешкі.

Толькі Іван Іванавіч стаяў атаропеўшы і з затаеным страхам пазіраў то на мышу, ляжайшую пластом сярод пакою, — то на дырэктара, і ніколі у жыцьці Івану Іванавічу не было так прыкра відзець свайго начальніка, як у гэты раз. Мамэнтамі здавалося Івану Івановічу, што дырэктар вот-вот згледзіць мышу, падойдзе да яго, Івана Івановіча, выпуча вочы...

— Мыш?.. У казённым банку — мыш!..— Там, дзе гэтулькі паперовых грошы?.!

Іван Іванавіч усімі вачыма упіваўся у твар дырэктара, і быў момэнт, што яму здалося, бытцам ён сам абярнуўся у мышу, а перад ім — не дырэктар банку—яго, Івана Іванавіча, начальнік — а вялізвы — вялізны кот с тырчашчымі вусамі...

Улучыўшы момэнт, Іван Іванавіч спрытна нагнуўся да мышы, хапіў яе за хвост і, ня гледзючы, з усяго размаху шпурьнуў яе у кут Але тут зрабілася як раз тое, чаго ніяк не спадзеваўся Іван Іванавіч. Мышка папала ня ў кут. як ён думаў, — а ў разчыненые дзьверы суседняго пакою, дзе сядзелі паненкі-машыністкі...

— А—ах!..

На крык паненак пазбегаліся з другіх пакояў. Падняўся рух. Пабеглі па ваду...

. . . . . . . . . . .

А бедная мышка пластом ляжала сярод пакою.

Глянуў на яе Іван Іванавіч і апусьціў галаву.

**Панас Гаварэнь.**

